*В.Э. РАБЫШКА*

# ФАКТАРЫ ЗМЕН НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СТРУКТУРЫ НАСЕЛЬНІЦТВА НА БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІМ ПАМЕЖЖЫ Ў 1919–1939 гг.

Исследуются процессы репатриации, проходившие в течение 1920-х гг., полонизаторская и ассимиляторская политика польских властей (1919–1939) в отношении национальных меньшинств Западной Беларуси; рассматривается деятельность культурно-просветительских обществ и организаций, способствующих сохранению национальной самобытности белорусов.

Processes of repatriation that took place in 1920s, policy of assimilation carried out by polish authorities (1919–1939) regarding national minorities in Western Belarus are investigated. Activity of cultural and educational organizations, which became the instrument of reservation of national originality of Belarusians is learned.

Вывучэнне этнапалітычных і сацыяльных працэсаў у памежных раёнах мае свае адметнасці, бо тут узаемадзейнічаюць розныя нацыянальныя культурныя, моўныя, эканамічныя і палітычныя ўплывы. Навукова актуальнай і практычна значнай для айчыннай гістарычнай навукі з'яўляецца неабходнасць прааналізаваць этнапалітычную сітуацыю на беларуска-польскіх і беларуска-літоўскіх памежных тэрыторыях на працягу 1919–1939 гг. і выявіць агульныя тэндэнцыі развіцця нацыянальных працэсаў на памежжы. Адным з важных момантаў для паспяховага дасягнення пастаўленай мэты выступае імкненне выявіць і даць ацэнку аб'ектыўным і суб'ектыўным фактарам, якія ўздзейнічалі на змену нацыянальнай структуры насельніцтва памежных зямель на працягу 1919–1939 гг.

Аналізуючы і падсумоўваючы матэрыялы этнографаў і мовазнаўцаў канца XIX ст. у адносінах да беларуска-польскага і беларуска-літоўскага памежжаў[1], дадзеныя Першага ўсеагульнага перапісу Расійскай імперыі 1897 г.[2], статыстычныя даследаванні польскіх гісторыкаў А. Крыжаноўскага і К. Куманецкага[3], можна прыйсці да высновы, што на памежных тэрыторыях пражывала большасць беларускамоўнага насельніцтва (65–83 %), акрамя некаторых паветаў, дзе пераважала польскае ці літоўскае. Колькасць палякаў і літоўцаў была даволі невялікая. Так, найбольш высокі працэнт палякаў размяшчаўся ў Бельскім (34,8 %) і Беластоцкім (33,9 %) паветах. У астатніх ён вагаўся ад 2 да 6,5 %. Дадзеныя перапісу па паветах паказалі, што на беларуска-літоўскім памежжы даволі складана казаць аб раўнамерным размяшчэнні жыхароў па нацыянальнасцях. У чатырох паветах (Вілейскім, Дзісненскім, Лідскім, Ашмянскім) дастаткова выразна пераважала беларускамоўнае насельніцтва, якое складала 75–85 %. Значны працэнт літоўскага знаходзіўся ў Свянцянскім павеце (33,8 %) і яшчэ большы – у Трокскім (58,0 %). Своеасаблівым нацыянальным складам адрозніваўся Віленскі павет, у якім асноўныя нацыянальнасці мелі амаль раўнамернае размяшчэнне.

Пытанне аб нацыянальна-тэрытарыяльным адзінстве беларускіх зямель у 1920-я гг. з'ўлялася галоўным для вызначэння існавання беларусаў як самастойнага этнасу, неабходнай умовай стварэння яго дзяржаўнасці. Праблема ўскладнялася тым, што кіруючыя колы Польшчы, як і Савецкай Расіі, не хацелі разглядаць Беларусь у якасці самастойнага суб'екта міжнародных адносін. Кіраўніцтва польскай дзяржавы лічыла этнічныя беларускія землі за Бугам арганічнай часткай Польшчы і тлумачыла неабходнасць іх далучэння "гістарычным правам", якое і было "рэалізавана" 18 сакавіка 1921 г. падпісаннем Рыжскага мірнага дагавора.

З моманту правядзення перапісу 1897 г. і да пачатку вывучаемага перыяду нацыянальная сітуацыя пад уплывам розных фактараў змянялася.

На нацыянальную структуру насельніцтва памежных тэрыторый, склаўшуюся ў пачатку 20-х гг. XX ст., уздзейнічаў істотны фактар аб'ектыўнага характару, які застаўся па-за ўвагай як польскіх, так і беларускіх даследчыкаў: эвакуацыя значнай колькасці беларускага насельніцтва з заходніх зямель



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Беларусі на ўсход падчас Першай сусветнай вайны і падзей польска-савецкай вайны (1919–1920), з аднаго боку, і незавершанасць рээвакуацыі – з другога. Гэта пэўным чынам змяняла нацыянальную сітуацыю на беларуска-польскім і беларуска-літоўскім памежжах. Так, аб прыкладных памерах эвакуацыі сведчаць наступныя лічбы. У ліпені 1915 г. на адрэзку шляху Кобрын – Пружаны – Баранавічы знаходзілася 400 тыс. бежанцаў, з іх 200 тыс. налічвалася толькі ў раёне Кобрына; іншы паток бежанцаў рухаўся цераз Пружаны – Слонім – Баранавічы і Беласток – Ваўкавыск – Слонім – Баранавічы. Колькасць зліўшыхся ў Баранавічах бежанцаў дасягнула ў жніўні 100 тыс. чал.[4] І гэта толькі асобныя лічбы.

Таксама на змены нацыянальнай сітуацыі на беларуска-польска-літоўскім памежжы аказала рэпатрыяцыя, дадзеныя аб якой і ўплыў гэтага працэсу на нацыянальную структуру насельніцтва прывёў польскі даследчык А. Крысінскі[5]. У дапаўненне да дадзеных, прыведзеных А. Крысінскім, каштоўным будзе выкарыстанне звестак аб насельніцтве і рэпатрыяцыі ў Палескім ваяводстве паводле архіўных дадзеных. Лічбы яскрава сведчаць, што працэс рэпатрыяцыі актыўна працягваўся да 1924 г. Колькасць рэпатрыяваных сведчыць аб тым, што гэты фактар аказаў немалаважны ўплыў на нацыянальна-дэмаграфічную сітуацыю на памежных тэрыторыях. Так, напрыклад, колькасць рэпатрыяваных у Пружанскім павеце на працягу 1921–1924 гг. складала 26 298 чалавек – 43,3 % ад агульнай колькасці насельніцтва паводле перапісу 1921 г.[6]

Адным з важных фактараў, які аказаў вялікі ўплыў на змены ў нацыянальна-дэмаграфічным складзе насельніцтва беларуска-польска-літоўскага памежжа ў вывучаемы перыяд, стала нацыянальная палітыка польскіх улад на памежных тэрыторыях. Яна насіла паланізатарскі і асімілятарскі характар, цалкам акрэсліла адносіны польскай адміністрацыі да патрэб адукацыі насельніцтва Заходняй Беларусі. Імкненне да асіміляцыі беларусаў і прадвызначыла тое, што асноўная тэндэнцыя ў галіне адукацыі закпючалася ў ліквідацыі беларускіх школ і павелічэнні колькасці спачатку двухмоўных беларуска-польскіх, а потым выкпючна польскіх школ. У выніку з 514 беларускіх пачатковых школ, што працавалі ў 1919/20 навучальным годзе, да 1922/23 налічвалася 32, а ў 1925/26 навучальным годзе – толькі восем[7]. Дзейсным сродкам апалячвання беларусаў стала распаўсюджванне польскай мовы ў рэлігійным і паўсядзённым жыцці.

Важнымі фактарамі асіміляцыі беларускага насельніцтва, якія прыводзілі да скарачэння працэнтнай колькасці беларусаў і адпаведнага павышэння працэнта палякаў на памежных тэрыторыях, была не толькі ліквідацыя беларускіх школ, але і павелічэнне колькасці польскіх школ. У 1925/26 навучальным годзе разам з ужо адкрытымі польскія школы складалі ў Беластоцкім ваяводстве 99 %, Віленскім – 94,7 %, Навагрудскім – 99,5 %, Палескім – 98,6 %[8]. У Беластоцкім ваяводстве ў 1937–1938 гг. сярод грамадскіх школ з польскай мовай навучання налічвалася 1 644 школы, з польскай і літоўскай мовамі – шэсць, з польскай і нямецкай – шэсць, з літоўскай мовай – адна, з беларускай – ніводнай[9]. Безумоўна, гэта пашырала сферу ўжытку польскай мовы і напрамую ўздзейнічала на працэс апалячвання беларусаў.

Змены міжнароднай сітуацыі таксама прадвызначылі паварот у нацыянальнай палітыцы польскіх улад. Ліга Нацый страціла здольнасць аказваць уздзеянне за парушэнні правоў няпольскага насельніцтва. Зручным для польскага ўрада стала і згортванне палітыкі беларусізацыі, культурна-нацыянальнага будаўніцтва ў БССР. Так, міністр замежных спраў Польшчы Ю. Бек на пасяджэнні Лігі Нацый у Жэневе ў верасні 1934 г. заявіў аб тым, што Польшча адмаўляецца ад дадзеных раней гарантый аб ахове правоў нацыянальных меншасцей[10]. Гэта грубае парушэнне норм еўрапейскай су-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

польнасці фактычна пазбавіла рэжым "санацыі" ад усялякай адказнасці за нацыянальны ўціск жыхароў Заходняй Беларусі. Улічваючы тое, што беларускім пытаннем ужо сур'ёзна не цікавіліся ні ў Мінску, ні ў Маскве, праблема этнічнага самазахавання заходнебеларускага насельніцтва рэзка абвастрылася.

Курс на ліквідацыю беларускай асветы таксама яскрава праявіўся ў закрыцці ў снежні 1936 г. беларускіх культурна-асветных арганізацый: Таварыства беларускай школы і Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, забароне дзейнасці ў жніўні 1937 г. Саюза беларускіх настаўнікаў, а ў студзені 1938 г. – Беларускага нацыянальнага камітэта – каардынуючага органа беларускіх нацыянальных дэмакратычных арганізацый. Польскія ўлады закрылі амаль усе раней існаваўшыя беларускія школы і гімназіі. У 1933/34 навучальным годзе паводле дадзеных афіцыйнай статыстыкі ў Заходняй Беларусі налічвалася ўсяго 16 школ, дзе вывучалася беларуская мова, а ў 1938/39 навучальным годзе не засталося ніводнай. У той самы час у Польшчы дзейнічала 457 украінскіх і 2 754 польска-ўкраінскія школы.

Рэлігійныя і нацыяналістычныя польскія ідэі настойліва прывіваліся ў розных формах пазакласнай работы: на вечарах, маніфестацыях, у час правядзення ваенізаваных паходаў і г. д. Займаліся гэтым у Заходняй Беларусі шматлікія польскія культурна-асветніцкія арганізацыі, клерыкальныя дзіцячыя ўстановы, гурткі. Там выкарыстоўваліся прывабныя, з улікам узросту, інтарэсаў, мерапрыемствы – святочныя (часцей – рэлігійныя) абрады, бясплатныя кінафільмы і інш.

Вялося наступленне і на беларускамоўныя сродкі масавай інфармацыі. Калі ў 1927 г. у Заходняй Беларусі легальна выдаваліся 23 беларускія газеты і часопісы, то ў 1930 г. іх стала 12, а ў 1932 г. – восем. Пад канец 1930-х гг. такіх выданняў амаль не было[11]. Польскія мясцовыя ўлады перашкаджалі рассылцы беларускіх газет, забіраючы іх на пошце. Тых, хто чытаў такія газеты, лічылі бальшавікамі (нягледзячы на тое, што газеты былі зусім не бальшавіцкія), праводзілі вобыскі і пагражалі арыштамі.

Паланізацыйная палітыка рэалізавалася разнастайнымі спосабамі. Для павелічэння колькасці польскага насельніцтва стымуляваліся каланізацыйныя працэсы. Напрыкпад, з 1920 да пачатку 1928 г. на Палессі ўзнікла каля 2 900 новых гаспадарак, з якіх 2 500 належалі палякам, а 342 – беларусам[12]. Падобныя каланізацыйныя акцыі адбываліся на памежных тэрыторыях. Гэта прынесла толькі адмоўны эфект. Паміж польскімі асаднікамі і мясцовым насельніцтвам даходзіла да канфліктаў, таму што першыя знаходзіліся ў прывілеяваным становішчы, атрымлівалі крэдыты і падаткавыя ільготы. З мэтай узмацнення польскасці спрабавалі стварыць так званы Саюз дробнае шляхты, які, у сваю чаргу, паглыбіў сацыяльныя антаганізмы на вёсцы.

Важнае месца ў ажыццяўленні палітыкі паланізацыі адводзілася рымска-каталіцкай царкве, якая павінна была звязаць Польшчу і "ўсходнія крэсы" ў адзіную дзяржаву. Палітыка дзяржавы накіроўвалася на павелічэнне колькасці каталіцкіх прыходаў, якія аказвалі непасрэдны ўплыў на мясцовае насельніцтва. Узмацненню пазіцый каталіцкай царквы садзейнічала рэвендыкцыя. Яе аснову скпадаў зварот культавых будынкаў, зямель, якія раней належалі католікам, але былі перададзены праваслаўнай царкве. Барацьба паміж каталіцкім і праваслаўным духавенствам за карыстанне культавымі будынкамі праводзілася на працягу ўсяго міжваеннага перыяду.

Такая палітыка садзейнічала таму, што на тэрыторыі Заходняй Беларусі павялічылася колькасць касцёлаў. Гэту тэндэнцыю яскрава пацвярджаюць дадзеныя Пінскай епархіі. Калі ў 1915 г. тут налічвалася 55 парафіяльных касцёлаў, то ў 1925 г. іх колькасць дасягнула 97, а ў 1935 г. – 130. На 1 студзеня 1937 г. на заходнебеларускіх землях дзейнічалі 5 480 парафій, аб'яднаных у 48 дэканатаў. У Віленскі гарадскі дэканат уваходзіла 46 касцёлаў,



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

якія налічвалі 147 990 вернікаў, у Брэсцкі – адпаведна 11 касцёлаў і 21 316 вернікаў, у Бераставіцкі гарадскі – 10 і 18 420, у Драгічынскі – 12 касцёлаў і 23 301 вернік, Гродзенскі – 19 і 42 973, Кобрынскі – 7 і 10 110, Лідскі – 21 і 78 478, Ашмянскі – 19 касцёлаў і 63 933 вернікі , Пружанскі – 7 і 12 394 і г. д.[13]

З першых дзён знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы ў беларускіх каталіцкіх прыходах павялася праца па выцясненні беларускай мовы. Многія прадстаўнікі польскага касцёла варожа ставіліся да ўсяго беларускага, у тым ліку і да карыстання беларускай мовай. Ужыванне ў касцёле толькі польскай мовы садзейнічала і паскарала працэс апалячвання беларусаў.

Знаходзячыся пад уплывам дзяржавы, праваслаўная царква стала ажыццяўляць палітыку паланізацыі. У сярэдзіне 1930-х гг. пачалі праводзіцца службы на польскай мове. Такога да гэтага часу не здаралася на беларускіх землях. Асабліва ўзмацнілася дзейнасць у такім накірунку пасля таго, як 7 сакавіка 1935 г. была створана камісія па справах праваслаўнага веравызнання, якая дзейнічала ў рамках Камітэта па нацыянальных справах. Яна выпрацавала спецыяльныя “Тэзісы” – праграму далейшай паланізацыі царквы.

Падводзячы вынікі аналізу нацыянальнай палітыкі польскіх улад у дачыненні да нацыянальных меншасцей, прыходзім да высновы, што яна насіла паланізатарскі і асімілятарскі характар. У цэлым нацыянальная палітыка польскіх улад на памежных тэрыторыях вызначалася рэакцыйнасцю. Яе вынікі прывялі да скарачэння працэнтнай колькасці беларусаў і павышэння лічбы палякаў. Аб гэтым яскрава сведчыць праведзены польскім урадам перапіс 1931 г.[14] Шматлікія беларусы, яўрэі і ўкраінцы, якія ведалі польскую мову, назвалі яе з розных прычын у якасці сваёй роднай. Шмат людзей няправільна паказалі на польскую мову як сваю родную, жадаючы прадэманстраваць лаяльнасць да польскай дзяржавы ці асцерагаючыся дыскрымінацыі. Значная частка насельніцтва ў адказ на пытанне пра нацыянальнасць адказвала «католік ці праваслаўны, гэта значыць атаясамляла каталіцызм з польскасцю, а праваслаўе з “рускаю вераю”, альбо акрэслівалася як “тутэйшыя”, баючыся заняць нейкае адназначнае становішча»[15]. Увядзенне польскай школы, якой аддавала перавагу каталіцкае насельніцтва, і набор маладых мужчын у польскае войска пашыралі сферу польскай мовы. Узрастаў працэнт двухмоўнага насельніцтва, якое ўжывала ў касцёле і горадзе польскую мову, а ў сям’і – “тутэйшую”. Малодшая генерацыя ўспрымала польскую мову, трактуючы яе як сацыяльна больш значную. Пераважная частка насельніцтва, што пражывала на Палессі і размаўляла на пераходных дыялектах, не была ў стане акрэсліцца ў мове і падала ў якасці роднай мовы так званую “тутэйшую”. Гэта сведчыць аб такім немалаважным фактары, як адсутнасць нацыянальнай свядомасці, што ўплывала на нацыянальную структуру насельніцтва беларуска-польска-літоўскага памежжа ў 1919–1939 гг.

Апублікаваныя вынікі перапісу паводле моўнага крытэрыю сведчылі аб трох паветах, дзе палякі выразна пераважалі (Шчучын – 83,5 %, насельніцтва прызнала польскую мову за сваю родную, Ашмяны – 81,3 %, Ліда – 79,3 %). Яшчэ ў двух паветах польскамоўнае насельніцтва дасягала 2/3 насельніцтва (Валожын – 66,5 %, Браслаў – 65,6 %). У некалькіх паветах Віленскага, Навагрудскага і Беластоцкага ваяводстваў існавала перавага палякаў ці была раўнавага паміж польскім і беларускім насельніцтвам. У той самы час ва ўсім Палескім ваяводстве значна пераважала беларускамоўнае насельніцтва (разам з “тутэйшай” мовай). Рускамоўнага насельніцтва было няшмат (галоўным чынам гэта – стараабрадцы, напрыклад, у паветах Браслаў і Дзісна). Значнай групай нацыянальнай меншасці з’яўляліся жыхары, якія ўжывалі яўрэйскую мову. У паўднёвай частцы на мяжы з Валынскім ваяводствам частка насельніцтва (у Берасцейскім павеце – 17,9 тыс. і ў Кобрынскім павеце –



This document has been edited with Infix PDF Editor
- free for non-commercial use.
To remove this notice, visit:
www.iceni.com/unlock.htm

21,9 тыс.) назвала роднай украінскую мову. У перапісе, праведзеным у 1897 г., амаль усё праваслаўнае насельніцтва ў гэтых двух паветах называла ўкраінскую мову. Гэта сведчыць пра эвалюцыю свядомасці і ўсё больш выразную ідэнтыфікацыю насельніцтва ў бок беларускай, а не ўкраінскай нацыі.

Этнакультурныя працэсы ў Заходняй Беларусі ад моманту ўключэння яе ў склад Польшчы і да ўз'яднання з БССР спрыялі працэсу самаідэнтыфікацыі беларускага народа, нягледзячы на асімілятарскую нацыянальную палітыку польскіх улад. Адразу пасля ўключэння Заходняй Беларусі ў склад Польшчы палітыка асіміляцыі сустрэла супрацьдзеянне. Яно праявілася не столькі ва ўзброенай барацьбе, якая набыла ў пачатку 1920-х гг. вялікі размах, колькі ў культурна-асветніцкім руху. Менавіта такая праца і паспрыяла стварэнню асновы для захавання адметнасці беларусаў, супрацьстаяння паланізацыі на працягу ўсяго вывучаемага перыяду.

Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыгралі культурна-асветныя таварыствы і арганізацыі. Менавіта іх дзейнасць і намаганні сталі сродкам захавання нацыянальнай адметнасці беларускага народа. Значны ўклад у распаўсюджванне адукацыі і асветы на памежных тэрыторыях, у выхаванне пачуцця нацыянальнай самасвядомасці беларусаў унеслі Таварыства беларускай школы, Беларускае навуковае таварыства, Беларускі студэнцкі саюз, Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, Таварыства беларускай асветы і інш.

Прыведзены фактычны матэрыял сведчыць, што пад уплывам фактараў як аб'ектыўнага, так і суб'ектыўнага характару адбыліся змены ў нацыянальнай структуры насельніцтва беларуска-польска-літоўскага памежжа ў 1919–1939 гг. Гэта занатавалася ў зніжэнні працэнтнай лічбы беларусаў і павышэнні колькасці палякаў. Аднак гэтыя этнічныя працэсы на працягу разглядаемага перыяду ішлі павольна. Хаця беларускае насельніцтва ў некаторых паветах і страціла свой перавес у дачыненні да іншых нацыянальнасцей, яно на большасці памежнай тэрыторыі пераважала. Беларусы імкнуліся супрацьстаяць паланізацыі і захаваць сваю самабытнасць, нацыянальную самаідэнтыфікацыю.

[1] Савченко В.Н. Восточнославянско-польское пограничье 1918–1921 гг. (этносоциальная ситуация и государственно-политическое размежевание). М., 1995. С. 24–32.

[2] Первая Всеобщая перепись населения Российской Империи 1897 года. Виленская губерния. Тетр. 3. СПб., 1903; Первая Всеобщая перепись населения Российской Империи 1897 года. Гродненская губерния. СПб., 1904.

[3] Цвікевіч А. Адраджэнне Беларусі і Польшча. Мн.; Вільня; Берлін, 1921.

[4] Бабков А.М. Беженцы в Белоруссии в годы Первой мировой войны (1915–1916) // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь. Мн., 1994. Ч. 1. С. 131–138.

[5] Krysinski A. Liczba I rozmieszczenie ludnosci polskiej na Kresach Wschodnich. Warszawa, 1929.

[6] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 2. Спр. 2001.

[7] Володина О.В., Федосова М.В. Политика польского правительства в области народного образования на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг. // Шлях у навуку: Матэрыялы 7-й рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. Гродна, 1997. С. 162.

[8] Rocznik statystytyki Rzeczypospolitej Polskiej. Warszawa, 1927. S. 388–391.

[9] Знешняя палітыка Беларусі: Зб. дак. і матэрыялаў (1928 г. – чэрвень 1941 г.): У 4 т. / Склад. У.М. Міхнюк, У.К. Ракашэвіч, Я.С. Фалей, А.В. Шарапа. Мн., 2001. Т. 3. С. 162.

[10] Ладысеў У. Беларускае пытанне ў Другой Рэчы Паспалітай 1919–1939 гг. // XX стагоддзе ў гісторыі палякаў і беларусаў. Мн., 2001. С. 165.

[11] Касцюк М. Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай сям'і // Назаўсёды разам: да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Мн., 1999. С. 6–8.

[12] Эберхардт П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1897–1989. Мн., 1997. С. 138.

[13] Навіцкі У. Рэлігійнае жыццё Заходняй Беларусі ў міжваенны час (1921–1939 гг.) // Назаўсёды разам: да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Мн., 1999. С. 69.

[14] Drugi powszechny spis ludnosci z dn. 9. XII. 1931 r. Statystyka Polska Seria C. Zeszyt 36. Wojewodstwo Wilenskie. Warszawa, 1936; Ibid. Zeszyt 71. Wojewodstwo Nowogrodzkie. Warszawa, 1938; Zeszyt 83. Wojewodstwo Bialostockie; Zeszyt 87. Wojewodstwo Poleskie.

[15] Эберхардт П. Указ. тв. С. 92.

Паступіў у рэдакцыю 14.04.2004.

***Вольга Эдуардаўна Рабышка*** – аспірантка кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар У.Ф. Ладысеў.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm